# АДМЕТНЫЯ РЫСЫ
# ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

***Я. Ф. Конеў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*egorkonev1970@gmail.com*

Прадметам разгляду з'яўляцца інфармацыйная прастора як паняцце, даследуюцца навуковыя падыходы да яго вывучэння. Сцвярджаецца, што інфармацыйная прастора – гэта гістарычна сфарміраваная і забяспечаная прававымі гарантыямі шматузроўневая сістэма скаардынаваных і структураваных інфармацыйных рэсурсаў, якія маюць найбольшую ступень даступнасці для спажыўцоў і акумулююць вынікі камунікацыйнай дзейнасці людзей. Даказана, што гістарычны фактар і прынцып традыцыяналізму з'яўляюцца дэтэрмінантнымі ў працэсе фарміравання інфармацыйнай прасторы Беларусі.

***Ключавыя словы:*** інфармацыйная прастора; Беларусь; сістэма інфармацыйных рэсурсаў; гістарычны фактар; прынцып традыцыяналізму.

# DISTINCTIVE FEATURES
# OF THE INFORMATION SPACE OF BELARUS

***E. F. Konev***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: E. F. Konev (egorkonev1970@gmail.com)*

The subject of consideration is the information space as a concept, scientific approaches to its study are explored. It is argued that the information space is a historically formed and legally guaranteed multi-level system of coordinated and structured information resources that have the highest degree of accessibility for consumers and accumulate the results of people's communication activities. It is proved that the historical factor and the principle of traditionalism are determinant in the process of forming the information space of Belarus.

***Key words***: information space; Belarus; information resource system; historical factor; the principle of traditionalism.

У 1994 г. упершыню ў рускамоўным навуковым асяродку было выкарыстана паняцце «інфармацыйная прастора». Яго ўжыў у сваім артыкуле «Інфармацыйныя рэсурсы Расіі» галоўны рэдактар навукова-практычнага часопіса «Інфармацыйныя рэсурсы Расіі» Алег Кедроўскі [1]. На мяжы ХХ–ХХІ стст. тэрмін «інфармацыйная прастора» стаўся агульнаўжывальным. Сёння на яго спасылаюцца як на ўніверсальнае паняцце палітычныя і грамадскія дзеячы, навукоўцы і публіцысты. У сувязі з гэтым паўстае слушнае пытанне: ці можна лічыць інфармацыйную прастору спараджэннем сучаснай эпохі? І нават больш за тое: ці мае наогул паняцце інфармацыйнай прасторы межы гістарычнай перыядызацыі?

Вядома, што вышэйзгаданы А. Кедроўскі з’яўляўся не вынаходнікам паняцця «інфармацыйная прастора», але перакладчыкам англамоўнага тэрміна «informational space», які з сярэдзіны 70-х гг. ХХ ст. выкарыстоўваўся ў даследаваннях такіх навукоўцаў, як К. Спаркс, Д. Нэсбіт, С. Вентурэлі, П. Эбурдзін, Ф. Уэбстэр, У. Датан, Р. Пікард, Т. Рантанен ды інш. [2, с. 31]. Аналізуючы працэсы ўзбуйнення вытворчасці інфармацыйнай прадукцыі ў краінах Захаду, гэтыя ды іншыя даследчыкі ўжывалі ў сваіх работах акрамя «informational space» таксама тэрміны «information environment» («інфармацыйнае асяроддзе») або «information field» («інфармацыйнае поле»). Дагэтуль дадзеныя тэрміны разглядаюцца або як сумежныя паняцці, або як сінонімы, аднак расійская даследчыца Т. А. Ажарэльева даволі абгрунтавана аспрэчыла і абвегла іхняе падабенства [3]. Таму ў рамках дадзенага аналізу менавіта тэрмін «інфармацыйная прастора» стварае ўяўленне наконт прасторы, у якой не толькі выпрацоўваецца, перамяшчаецца і выкарыстоўваецца інфармацыя, але і на гэтай падставе адлюстроўваецца светаўспрыманне людзей пэўнай эпохі ў канкрэтнай краіне.

Само паняцце «прастора» мае шырокі ўжытак у самых розных галінах ведаў – ад матэматыкі і фізікі (трохмерная прастора, фазавая прастора ды інш.) да рэлігіі і аэранаўтыкі (сакральная прастора, касмічная прастора). Што тычыцца інфармацыйнай прасторы, то найбольш універсальным нам падаецца вызначэнне расійскай даследчыцы М. В. Катковай, паводле якога гэта гістарычна сфарміраваная і забяспечаная прававымі гарантыямі шматузроўневая сістэма скаардынаваных і структураваных інфармацыйных рэсурсаў, якія маюць высокую ступень дасягальнасці для спажыўцоў і акумулююць вынікі камунікацыйнай дзейнасці людзей [4]. Таксама нельга не пагадзіцца з меркаваннем расійскай даследчыцы І. А. Дабравольскай, што распаўсюджанне паняцця «інфармацыйная прастора» было абумоўлена ростам запатрабаванасці грамадства ў інфармаванні ды звязана з укараненнем інавацыйных тэхналогій, якія

істотна скарацілі час дастаўкі інфармацыі да аўдыторыі [5]. Аднак ва ўсіх згаданых падыходах да вызначэння інфармацыйнай прасторы, з нашага пункту гледжання, недаацэньваецца гістарычны фактар яе фарміравання, а між тым менавіта ён вызначае сутнасць канцэпцый, ідэй і тэорый, якія маюць грамадскі розгалас і ствараюць парадыгму нацыянальнага развіцця.

На працягу стагоддзяў – з моманту з’яўлення на беларусіх землях першых неперыядычных выданняў у XVI ст. – наша інфармацыйная прастора не толькі знаёміла жыхароў Беларусі з назапашанай чалавецтвам інфармацыяй аб Сусвеце, але і ўплывала на фарміраванне нацыі ды яе культуры, забяспечвала дыялог паміж асобай і грамадствам, спрыяла ўтварэнню дзяржаўнасці, далучала краіну да сусветных інфармацыйна-камунікацыйных працэсаў. Утварыўшыся на сутыку гісторыі, геаграфіі і нацыянальнай культуры, інфармацыйная прастора Беларусі ўвасабляла базавыя ўяўленні народа аб разнастайных сферах духоўнага і матэрыяльнага жыцця і, разам з тым, фарміравала беларускі этнас на падставе распаўсюджання ідэй, канцэпцый, меркаванняў, навінаў ды інш. Феномен інфармацыйнай прасторы заключаецца ў тым, што яна адлюстроўвае розныя стадыі жыццядзейнасці як асобнага чалавека, так і ўсяго грамадства [6, с. 55]. Адпаведным чынам злучаючы і акумулюючы дзейнасць асобнага чалавека і грамадства, інфармацыйная прастора дэманструе іхні ўзаемаўплыў і ўтварэнне суб’ектна-аб’ектнага адзінства. У выніку ў інфармацыйнай прасторы адбываецца няспыннае супрацьстаянне або ўзаемаўздзеянне паміж ідэалагічнымі, сацыяльна-палітычнымі, эстэтычнымі ды інш. каштоўнасцямі, што вядзе да стварэння прадуктаў інфармацыйнай дзейнасці, культуратворчасці і г. д.

Больш дакладна эвалюцыйны характар фарміравання інфармацыйнай прасторы Беларусі адлюстроўвае спалучэнне вертыкальнага і гарызантальнага параметраў. Пад вертыкальным параметрам маецца на ўвазе стан інфапрасторы ў пэўны гістарычны перыяд, а пад гарызантальным – колькасныя і якасныя (звязаныя з жанрава-творчымі характарыстыкамі інфармацыйных прадуктаў) паказчыкі гэтага развіцця. Напрыклад, у 1838 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў функцыянавалі ўсяго 5 газет («Минские губернские ведомости», «Витебские губернские ведомости», «Могилевские губернские ведомости» ды інш.), праз сто гадоў у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы іх кольскасць узрасла больш чым у пяцьдзясят разоў – да 250 газет і 18 часопісаў, а на пачатку 2022 г. у Рэспубліцы Беларусь выходзілі звыш 1200 газет, часопісаў і альманахаў, а таксама іх электронных версій, многія з якіх па аб’ёме і разнастайнасці кантэнту пераўзыходзяць папяровыя версіі. Што тычыцца

жанрава-тэматычнай разнастайнасці, то ў сярэдзіне XIX ст. найбольш распаўсюджанымі жанрамі былі інфармацыйная заметка, артыкул і нарыс, у сярэдзіне XX ст. жанравая палітра ўзбагацілася карэспандэнцыяй, аглядам, фельетонам ды інш., а пачатак XXI ст. дадаў да іх такія жанры сеткавай журналістыкі, як лангрыд (разнастайнасць аб'ёмнага артыкула), твіт (заметка або каментарый аб'ёмам да 140 знакаў), анлайн-рэпартаж (асвятленне рэзазанснай падзеі ў рэжыме рэальнага часу), блог (разнастайнасць аўтарскай калонкі) ды інш. Такім чынам, спалучэнне вертыкальнага (часавага) і гарызантальнага (колькасна-якаснага) паказчыкаў сведчаць, што ўзбагачэнне і ўзбуйненне нашай інфармацыйнай прасторы адлюстроўвала гістарычную трансфармацыю пяці губерняў Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі да дэкларатыўна незалежнай БССР у складзе СССР і ўрэшце да рэальна суверэннай Рэспублікі Беларусь. Далейшым кірункам дадзенай парадыгмы, найбольш верагодна, з'яўляецца ўваходжанне Беларусі ў шэраг інфармацыйна развітых краінаў, у якіх эканоміка развіваецца на падставе інфармацыйных тэхналогій, а сама інфармацыя з'яўляецца прыбытковым таварам.

Ужо зараз можна назіраць, што мадэль гарызантальнага развіцця інфармацыйнай прасторы Беларусі нагадвае сінусоіду, якая з цягам часу безупынна разгаліноўвалася, што было звязана з узбагачэннем жанравай і тэматычнай разнастайнасці, з'яўленнем новых выданняў і інш. Дадзеныя працэсы далі ў свой час падставу славутаму даследчыку беларускай журналістыкі Міхасю Васільевічу Стральцову апісаць іх як рост нацыянальнага Інфармацыйнага Дрэва. На гэтым Дрэве «некаторыя галіны выцягваліся высока, а некаторыя адсыхалі, некаторыя пакрываліся лістотай густа, некаторыя – чэзлі» [7, с. 12]. Напрыклад, друк машынна-будаўнічых станцый, які ў пачатку 1960-х гг. налічваў толькі ў БССР дзясяткі выданняў, знік пасля 1965 г., даказаўшы сваю бесперспектыўнасць. Між тым сеткавыя выданні, якія напрыканцы 1990-х гг. функцыянавалі ў выглядзе інтэрнэт-старонкі з анонсамі цікавых артыкулаў друкаванай версіі, ужо праз паўтара дзесяцігоддзя паразрасталіся ў гіпертэкставыя рэсурсы, якія па колькасці карыстальнікаў і паказчыкаў «дачытальнасці» публікацый значна пераўзыходзілі друкаваныя выданні. Аднак скіраванасць Беларускага Інфармацыйнага Дрэва ў прасторава-часовую «вышыню» сталася магчымым менавіта дзякуючы яго глыбокім гістарычным караням.

Сярод замежных даследчыкаў у галіне медыя досыць пашырана меркаванне, нібыта традыцыі нацыянальнай гісторыі, культуры, менталітэту ды інш. не маюць істотнага дачынення да развіцця інфармацыйных тэхналогій, паколькі, маўляў, традыцыя – рэч уяўная і да рэальнага

прагрэсу насамрэч не дапасуецца. Такія меркаванні можна сустрэць у творах «Глабальнае и нацыянальнае» фінскага медыёлага Тэрхі Рантанен, «Тэорыі Інфармацыйнага Грамадства» англійскага сацыёлага Фрэнка Уэбстэра, «Мегатэндэнцыі» амерыканскага футуролага Патрыцыі Эбурдзін ды інш. Аднак працэсы фарміравання інфармацыйнай прасторы Беларусі яскрава сведчаць пра яе традыцыяналісцкі характар. Традыцыі, якія сфарміраваліся ў выніку збегу гістарычных абставінаў, на працягу стагоддзяў адыгрывалі дэтэрмінантную ролю ў працэсах інфармацыйнага, камунікацыйнага і культурнага развіцця. Прыкладам можа служыць ужыванне ў якасці змястоўна-знакавай сістэмы друку кірылічнага шрыфту, які ўкараняўся на беларускіх землях з X ст., а сучасны выгляд пачаў набываць з XVI ст. – часу распаўсюджання кніг Францыска Скарыны і Сымона Буднага. Нягледзячы на тое, што з XIX ст. у беларускім друку раз-пораз усчыналася палеміка наконт замены кірыліцы на лацінскі шрыфт, перавага традыцыяналіскага прынцыпу, паводле якога кірыліца больш адпавядае нацыянальнаму характару беларусаў, дагэтуль засталася непахіснай.

Падсумоўваючы вынікі, мяркуем мэтазгодным зазначыць, што найбольш універсальным вызначэннем інфармацыйнай прасторы з’яўляецца тое, што гэта гістарычна сфарміраваная і забяспечаная прававымі гарантыямі шматузроўневая сістэма скаардынаваных і структураваных інфармацыйных рэсурсаў, якія маюць высокую ступень дасягальнасці для спажыўцоў і акумулююць вынікі камунікацыйнай дзейнасці людзей. Разам з гэтымі ўніверсальнымі характарыстыкамі спалучаюцца адметныя рысы інфапрасторы Беларусі, да якіх належаць гістарычны фактар і традыяналісцкі прынцып развіцця. Дзякуючы ім інфармацыйная прастора Беларусі здолела ўвасобіць і адлюстраваць спрадвечнае імкненне нашага народа да дзяржаўнага суверэнітэту, асабістай свабоды і эканамічнага дабрабыту.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Кедровский О. В.* Информационное пространство России // Информационные ресурсы России. 1994. № 4. С. 2–3.
2. *Вартанова Е. Л.* Финская модель на рубеже столетий. Информационное Общество и СМИ Финляндии в европейской перспективе. М.: Изд-во Москов. ун-та, 1999. 287 с.
3. *Ожерельева Т. А.* Об отношении понятий информационное пространство, информационное поле, информационная среда и семантическое окружение // Международный журнал прикладных и фундаментальных исследований. 2014. № 10. С. 21–24.

4. *Каткова М. В.* Понятие «информационное пространство» в современной социальной философии // Известия Саратовского университета. Сер. Философия. Психология. Педагогика. 2008. Вып. 2. С. 23–26.
5. *Добровольская И. А.* Понятие «Информационное пространство»: различные подходы к его изучению и особенности // Вестник Российского университета дружбы народов. Сер. Литературоведение. 2014. Вып. 4. С. 12–21.
6. *Сарока С. М.* Архітэктоніка інфармацыйнай прасторы беларускай культуры XIX – пачатку XX стагоддзя. Наваполацк: Полац. дзярж. ун-т, 2016. 292 с.
7. *Стральцоў Б.* Розумам і сэрцам // Публицисты / сост.: Л. Екель и др. Мінск: БСЖ, 2000. 495 с.